# ВЁСЦЫ РОЛЯ ЗЯМЕЛЬНЫХ КАМІТЭТАЎ У АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ЎРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ (САКАВІК—КАСТРЫЧНІК 1917 Г.)

*І.М. Рыжанкоў*
Навуковы кіраўнік – д.гіст.н., дацэнт ***М.Я. Сяменчык***
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт*

Са звяржэннем царызму праблема забеспячэння харчовай незалежнасці Расіі паўстала на новы дзяржаўны ўзровень, шляхі вырашэння якой знаходзіліся не столькі ў эканамічнай, колькі палітычнай плоскасці. Вядома, што клопат аб будучым ураджаі, недахоп зямлі, ад якой пакутвала значная маса сялянства краіны ў тым ліку і беларускае, грабежніцкія акцыі сялян супраць памешчыкаў, дзейнасць левых палітычных сіл штурхалі Часовы ўрад у бок аграрных рэформ. Было відавочна, што аграрнае пытанне шырэй за харчовую праблему і створаных для яе вырашэння структур (харчовыя камітэты). Менавіта таму, 21 красавіка Часовы ўрад прыняў чарговую пастанову аб зямельных камітэтах, якія б заняліся падрыхтоўкай аграрнай рэформы [2, с. 348]. Задачай зноў ствараемых павятовых і валасных выбарных органаў аб'яўлялася высвятленне зямельнай патрэбы мясцовага насельніцтва – "...сабраць усе неабходныя аб ёй звесткі да Устаноўчага схода, каб апошні, як толькі будзе скліканы, мог неадкладна і па ўсёй справядлівасці вырашыць зямельнае пытанне, прыняць да ўвагі ўсе мясцовыя патрэбы і асабліва ўмовы асобных мясцовасцяў" [2, с. 267].

Кропкай адліку пачатку прапаганды і агітацыі зямельных камітэтаў на неакупаванай Беларусі можна лічыць выступленне міністра земляробства Шынгарова (1 мая) на І з'ездзе Саветаў сялянскіх дэпутатаў Магілёўскай губерні. Таксама ў першай палове мая неаднаразова губернскі камісар Мінскай губерні Б. Самойленка падкрэсліваў неабходнасць заснавання зямельных камітэтаў па прычыне абвастрэння рабаўніцкіх настрояў на вёсцы [1, 7 мая].

На пры канцы мая – пачатку чэрвеня некаторае запавольванне арганізацыі зямельных камітэтаў занепакоіла Часовы ўрад, які аддаў загад з выпадку стварэння Галоўнага зямельнага камітэта з прадстаўніцтвам у ім адпаведных губернскіх структур. Гэтае рашэнне стымулівала стварэнне зямельных камітэтаў усіх узроўняў (Мінскім старшынёй губернскага зямельнага камітэта быў абраны – С. Кавалік, Магілёўскім адпаведна – П. Воранаў, Віцебскім – А. Драздзецкі). Разам з паўсюдным заснаваннем правінцыянальных камітэтаў (павятовых і валасных) па Мінскай губерні адзначалася "аслабленне аграрнага руху", "колькасць эксцэсаў зменшылася" [1, 16 июня]. Цікава, што з пашырэннем і развіццём сеткі зямельных камітэтаў на Беларусі сялянскі рух у некаторых мясцінах змяніў сваё злачыннае аблічча і спрабаваў прыняць выявы законнасці. Так неаднаразова азначаныя камітэты (не маючы на тое паўнамоцтваў) выдавалі дазвол на захоп памешчыцкай і казённай зямлі, сенакосаў, высечку леса і г. д., нават з выплатай грошаў у камітэт.

Варта адзначыць, што статус зямельных камітэтаў быў нявызначаным. Іх функцыі перапляталіся з функцыямі ўлад Часовага ўрада, у пытаннях заспакаення – камітэтаў Сялянскага саюза, Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і інш, што не перашкаджала даволі цеснаму і плённаму іх супрацоўніцтву. Нягледзячы на пералічаныя акалічнасці на пачатку восені ў Магілёўскай губерні дзейнічала – 146, у Віцебскай – 196, у Мінскай – 202 зямельных камітэтаў [3, с. 137 - 138]. На нашу думку, унікальнасць даследуемых камітэтаў выяўлялася ў іх надкласавай сутнасці, якія (у сваёй дзейнасці) кіраваліся найперш інтарэсамі дзяржавы, а праз іх – і інтарэсамі ўсяго грамадства, а не асобных яго пластоў.

Высокі ўзровень актыўнасці сялянскіх мас у выбарах ва Устаноўчы сход сведчыць аб выкананні зямельнымі камітэтамі сваёй галоўнай задачы – падрыхтоўка вёскі да выбараў, як у сацыяльна-эканамічным, палітычным, так і маральна-псіхалагічным сэнсе.

**Літаратура**

1. Вестник Минского губернского комиссариата. 1917.
2. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Белоруссия в период подготовки социалитической революции (февраль – октябрь). Мн., 1957. Т. 1.
3. Кострикин В. И. Земельные комитеты в 1917 году. М., 1975.